

Грамадска-палітычная газета для жыхароў Бялыніцкага, Круглянскага і Шклоўскага раёнаў

Рэгіён

Люты 2012 г.

Литовские бизнесмены пристроили бывшего могилевского мэра



Виктор Шориков

Бывшие чиновники могилевской городской вертикали нашли себе литовских работодателей. Экс-мэр Виктор Шориков, по информации «Ежедневника», например, занял должность одного из заместителей директора в компании «ВМГ Индустри».

Напомним, что Виктор Шориков возглавлял Могилев почти 8 лет. Осенью 2009 года он написал заявление об уходе по собственному желанию. Некоторое время Шориков проработал в качестве главы управления Фонда социальной защиты Могилевской области. Но его опыт и связи, похоже, оказались к месту, когда к Могилеву и белорусским лесам проявили интерес литовские инвесторы.

В последние годы своего правления Шориков пытался прослыть чуть ли не самым прогрессивным городским руководителем. При нем в Могилеве восстановили историческое здание городской ратуши, при нем же впервые руководитель такого уровня завел собственный блог. На собственной Интернет страничке Шориков делился своими соображениями по поводу благоустройства города и цитировал Мольера. Впрочем, начитанность Шорикову не помогла. Накануне своего 60-летия (на посту «мэра» Шориков находился что-то около восьми лет) любителя французской классики попросили освободить занимаемое кресло. Кстати говоря, сведущие могилевчане не исключали коррупционную составляющую деяний Шорикова. Несмотря на то, что опальный экс-градоначальник некогда был среди основателей ОГП вместе с Василем Шлындиковым, искать подводные политические камни не следует. В деловых кругах могилевского начальника прозвали обидной, но точной кличкой «штука». Потом за начальником закрепилось другое прозвище: «две штуки».

«ВМГ Индустри» — это крупный проект, который реализуют в рамках СЭЗ «Могилев» совладельцы литовского деревообрабатывающего холдинга Vakaru Medienos Grupe Сигитас Паулаускас и Викторас Адомайтис. В начале 2011 года они подписали с могилевскими властями инвестиционный договор о создании вертикально интегрированного деревообрабатывающего комплекса с объемом инвестиций 64,3 млн евро. Кроме собственных средств, VMG привлекает в качестве соинвесторов шведские компании — IKEA, Euler Hermes Bank и Swedfund. Заинтересованность в финансировании проекта выразил Европейский банк реконструкции и развития.

По материалам Ej.by и ucpb.org

Краязнаўца са Шклова прапанаваў сваю версію забойства тысячагадовай даўніны



Міхаіл Кучарэнка лічыць, што святых князёў Барыса і Глеба забілі па загадзе Яраслава Мудрага, а не князя Святаполка, якога пазней празвалі “Акаянным”.

Да такой высновы шклоўскі краязнаўца прыйшоў пасля шматгадовага вывучэння старажытных рускіх летапісаў. Згодна меркавання Міхаіла Кучарэнкі, Яраслаў Мудры загадаў забіць сваіх братоў Барыс і Глеба таму, што яны заявілі аб сваёй вернасці Святаполку і пакляліся “паважаць яго як бацьку свайго”.

Шклоўскі краянаўца таксама сцвярджае, што забойства князя Глеба ў 1015 годзе адбылось на Дняпры непадалёк ад сучаснага Шклова. У абарону сваёй версіі ён падрыхтаваў вялікі артыкул, дзе выкладае свае меркаванні на гэты конт.

Яшчэ адзін пераканаўчы доказ таго, што ўсе значныя падзеі на нашай зямлі пачыналісь менавіта са Шклова ...

Багдан Іваноў



Сиротский хлеб



Кассирша банка в Белыничах не постеснялась украсть у обездоленного ребенка одиннадцать миллионов рублей.

Обычная деревенька в Мстиславском районе, которая находится вдалеке от оживленной трассы. Небольшой домик, скромная и уютная обстановка. Именно сюда, к своему мужу, переехала молодая женщина, которую обокрала сотрудница белыничского банка. Сейчас Зина Бондарева вспоминает о событиях лета, как о дурном сне. Жизнь постепенно вернулась в спокойное русло. Деньги ей вернули, она вместе с любимым человеком, два месяца назад у них родился сынишка.

Для Зины одиннадцать миллионов — сумма огромная. Ведь свое сиротское пособие она копила все время, пока жила в интернате. Да и после того как повзрослела и поступила в училище, старалась экономить деньги. Тратила только половину, остальное перечисляла на счет.

Радость всей семьи

Несмотря на то что приехала я довольно рано, в доме спал только малыш. Взрослые были уже давно на ногах. Мама мужа уехала час назад на ферму в соседнюю деревню. Денис управился с хозяйством и тоже собирался на службу.

— По специальности я строитель, работал в частной фирме в Могилеве, — рассказывает глава молодой семьи. — Но этим летом умер папа, поэтому пришлось уволиться и распрощаться с городской жизнью. Надо какое-то время поддержать маму, ей сейчас трудно справляться одной. Да и Зине нужно помочь поднять Егорку. Ведь он совсем кроха.

О малыше Денис говорит с нескрываемой нежностью. Признается, что испытал неимоверную радость, когда Зина сообщила о своей беременности. И был сразу уверен, что родится сынишка. Даже с другом поспорили на этот счет. Для бабушки, Ирины Владимировны, внук стал настоящим спасением. Приходит с работы, берет на руки это маленькое существо и чувствует, что она кому-то нужна. И пережитое горе — недавняя потеря мужа — хоть чуть-чуть, но отпускает.

Приняли, как свою

Рассказывать о сокровенном приехавшему корреспонденту не так-то просто. Растопить лед помог Егорка. Он проголодался и захныкал, мама стала его кормить и с гордостью сказала: “Все твердят, что сынуля похож на меня, и я сделаю все, чтобы он был счастливым”.

Своих родителей Зина почти не помнит. Девочка осиротела, когда ей было всего пять лет. Маму задавил трактор, а отец умер практически сразу после ее гибели. Малышка много плакала, не могла понять, что произошло. А потом девчушку забрали в интернат, где она пробыла до шестнадцати лет. И все это время Зина мечтала о своей семье.

С Денисом девушка познакомилась, когда училась в Могилеве. Он со своим другом пришел к знакомым девчонкам в общежитие. Парень попросил у Зины номер телефона. Ребята начали перезваниваться, а спустя какое-то время Денис предложил съездить в гости к своим родителям. Зина не скрывает, что очень трусила и от волнения не могла вымолвить и слова. Но здесь приняли ее, как свою. И с этого момента она стала ездить в деревню в Мстиславском районе, как к себе домой. Наверное, и известие о том, что накопленные сбережения уплыли в неизвестном направлении, она пережила намного спокойнее потому, что чувствовала поддержку.

“Твоя подпись. Не узнаешь?”

Обнаружила пропажу своих денег Зина совершенно случайно. Решила снять небольшую сумму, чтобы купить зимнюю куртку. А в банке сказали, что счет давно уже закрыт.

— Я была в полной растерянности, — вспоминает девушка. — В недоумении разводила руками и твердила одно и то же: как такое может быть?

— Но ведь ты сама сняла деньги со счета. Вот и подпись твоя стоит. Не узнаешь? — такое объяснение служащих и вовсе повергло Зину в шок. Она вышла на крыльцо и от бессилия расплакалась. Глотая слезы, позвонила Денису. Муж, как мог, старался успокоить любимую, которая ждала малыша.

— Конечно, для Зины одиннадцать миллионов — сумма огромная, и эта потеря была настоящим ударом, — говорит Денис.— Ведь свое сиротское пособие она копила все время, пока жила в интернате. Да и после того как повзрослела и поступила в училище, старалась экономить деньги. Тратила только половину, остальное перечисляла на счет. А в результате все усилия пошли прахом и она оказалась без копейки. Знаете, что больше всего меня возмущает? В голове не укладывается, что деньги могли пропасть из банка. Кому тогда доверять?

Когда волнение слегка улеглось, Зина вспомнила, что есть человек, на чью помощь всегда можно рассчитывать. Она тут же набрала номер директора школы-интерната, и дело закрутилось.

(Продолжение на ст. 3)

Сиротский хлеб

(Окончание. Нач. на ст. 2)

Они вместе написали заявление в милицию и сходили в райисполком. То, что к исчезновению денег Зина не имеет никакого отношения, выяснилось практически сразу. Во-первых, камеры видеонаблюдения подтвердили, что в те дни, когда снимались деньги, девушка в банке не появлялась. А во-вторых, экспертиза показала, что на документах стоит поддельная подпись.

Спустя какое-то время в Долговичи приехал следователь, расспрашивал Зину, о друзьях и знакомых — отрабатывалась версия ближнего окружения. А потом, сопоставив некоторые факты, заинтересовались кассиром Анжелой, чья подпись стояла на всех банковских операциях, связанных со счетом Зины. Именно она грела руки на сиротских деньгах. На данный момент женщина находится под следствием. Когда выяснился этот неприглядный факт, руководство банка вернуло девушке украденный вклад. Причем с процентами, которые она потеряла.

— Наверное, на радостях израсходовали уже всю сумму? — поинтересовалась я.

— Нет. Деньги пока лежат на другом счете, — ответила Зина. — Планируем потратить их чуть позже — на новую двухкомнатную квартиру. Я стою на очереди в Славгороде, где работала швеей по распределению. Обещают, что через пару месяцев сыграем новоселье. Нужно будет обустроиться, купить мебель. Малышу коляску выбрать, зимой в деревне она пока не нужна.

Горько. Обидно. И стыдно

Белыничи — город маленький, здесь практически все друг друга знают, поэтому произошедший инцидент вызвал большой резонанс среди местных жителей.

— Какое же сердце нужно иметь, чтобы решиться на такое, — говорит пенсионерка Зинаида Михайловна. — В послевоенные годы в деревнях, наоборот, жалели этих обездоленных детей, помогали им всем селом кто чем мог. А сейчас у людей не осталось ничего святого.

— Мы ищем спонсоров за границей, — рассказывают педагоги школы-интерната. — И чужие люди откликаются, а здесь белорус обворовал своего же белоруса. Горько. Обидно. И стыдно.

Причем шокирует то, что мошенничество не было сиюминутным помутнением рассудка. По имеющейся информации, деньги со счета детей-сирот снимались уже давно, еще с декабря 2010 года, так что данный эпизод — отнюдь не единственный. Сейчас прокуратура проверяет счета всех воспитанников Белыничской школы-интерната. И если факты подтвердятся, банк пообещал вернуть украденные суммы и остальным ребятам. Впрочем, этому учреждению ничего другого не остается, нужно хоть как-то реабилитировать свою подмоченную репутацию. От более подробных комментариев сотрудники банка пока воздерживаются, в интересах следствия не разглашается и информация, в каком конкретно заведении работала подозреваемая кассирша.

На что рассчитывал человек, который беззастенчиво наживался на детях? Скорее всего, на то, что обвести вокруг пальца сирот раз плюнуть. Что многие из них в обычной жизни ничего не понимают, не будут искать правду и поверят в любой обман... Жесткий, циничный, бесчеловечный расчет. И кто знает, не забей вовремя Зина тревогу, местная “коллега” Остапа Бендера могла бы дальше проворачивать свои комбинации.

Когда я возвращалась домой, покоя не давала одна мысль. Неужели у молодой женщины, имеющей собственных детей, ни разу не дрогнуло сердце, когда она заходила в магазины, доставала из кошелька ворованные деньги и покупала своим ребятам вещи? Ведь где-то совсем рядом жили другие дети, те, кого она лишила этой возможности, кто проходил мимо и с завистью смотрел на сверкающие витрины, чьи мечты оказались несбыточными из-за одного росчерка пера. Как можно спокойно спать, когда на совести такой камень?

Светлана ЛОЦМАНОВА, “НГ”
e-mail: locman_sv@tut.by

Шклоўшчына патроху вымірае



За дванаццаць месяцаў 2011 года ў Шклоўскім раёне памерла 610 чалавек, а за той жа перыяд нарадзілась толькі 322 дзіцяці. Натуральнае змяншэнне насельніцтва склала 288 чалавек, паведамляе Шклоўскі раённы аддзел статыстыкі.

Асноўнымі чыннікамі смерці з’яўляюцца хваробы сістэмы кровазвароту, знешнія прычыны смерці, гаваўтварэнні, хваробы органаў стрававання.

У Шклоўскім раёне застаецца высокай смяротнасць ад чыннікаў, не звязаных з захворваннем: за 2011 год – 76 выпадкаў, у тым ліку ад самазабойстваў і выпадковых атручэнняў алкаголем – па 10, забойстваў – 4 выпадкі.

За 2011 год у Шклоўскі раён прыбыло 513 чалавек, выбыла – 690. Міграцыйны адток насельніцтва склаў 177 чалавек.

Калі насельніцтва малой радзімы Аляксандра Лукашынкі будзе працягваць змяншацца такімі хуткімі тэмпамі, то хто будзе гуляць у хакей у будуемым лядовым палацы?

Богданкевич: К концу года курс доллара будет примерно Br10 тысяч



Станислав Богданкевич

Недоверие к белорусскому рублю никуда не исчезло, потому что инфляция не прекращается, а продолжает расти. Кроме того, ожидания роста цен значительны: население понимает, что увеличение рублевой денежной массы, связанное с повышением зарплат, пенсий, пособий, неизбежно приведет к новому росту цен. Такое мнение корреспонденту сайта "Товарищ.online" высказал экс-глава Национального банка Беларуси, профессор Станислав Богданкевич.

Сегодня главный банк страны опубликовал Сведения об операциях физических лиц по покупке-продаже иностранной валюты на внутреннем валютном рынке. По его данным, за первый месяц года банки приобрели у граждан валюты на 480,5 миллиона долларов (в эквиваленте), а продали на 279,5 миллиона долларов (в эквиваленте).

"Я думаю, что это говорит о том, что населению не хватает денег для покупки товаров, для поддержания своего уровня жизни. Поэтому оно начинает тратить те сбережения, которые были накоплены ранее", - сказал Станислав Богданкевич.

По его мнению, на самом деле в прошлом году цены выросли не в 2 раза, а в 2,5-3 раза. Ведь в "корзину" обычно включают социальные товары, цены на которые наиболее приемлемые для бедных слоев населения, а не качественные товары.

Однако он убежден, что в ближайшее время тенденция заметно изменится. "Если моя оценка о причинах превышения продажи над покупкой валюты правильная, то тенденция обязательно поменяется, - говорит эксперт. - Белорусских денег станет больше, и у населения не будет необходимости продавать валюту".

Экс-глава Нацбанка утверждает, что недоверие к национальной валюте "никуда не исчезло, потому что инфляция не прекращается, а продолжает расти". "Кроме того, ожидания роста цен значительны: население довольно образованное, и оно понимает, что увеличение рублевой денежной массы, связанное с повышением зарплат, пенсий, пособий, неизбежно приведет к новому росту цен", - подчеркнул Станислав Богданкевич.

Оценивая мнение экономиста Ярослава Романчука, высказанное сайту "Товарищ.online", о том, что уже в апреле курс доллара резко поползет вверх, экономист заметил: "Трудно говорить относительно месяца-двух. Я не думаю, что такой обвал начнется уже в апреле, он будет протекать постепенно, в течение всего года. Я давал когда-то оценку, что к концу 2012 года в лучшем случае курс белорусского рубля будет на уровне, имея в виду небольшой "плюс-минус", 10 тысяч рублей. Я и сейчас придерживаюсь этой позиции".

Товарищ.online

Віншуем!

Бяльніцкая раённая суполка партыі і Руху БНФ "Адраджэнне" віншуе сябра арганізацыі Данышава Пятра Давыдавіча з 70-гадовым юбілеем! Здароўя, аптымізму і ўсяго самага найленшага!

Нават малая радзіма Аляксандра Лукашэнкі не можа разлічыцца з даўгамі



Прадпрыемствы Шклоўскага і Круглянскага раёнаў Магілёўскай вобласці не разлічваюцца з будаўнікамі круглянскага ПМК-266 за выкананую працу. Сума запазычанасці за ўжо выкананыя аб'ёмы работ складае некалькі дзесяткаў мільярдаў рублёў. Кіраўнік круглянскага ПМК-266 Мікалай Патрончык яшчэ ў лістападзе 2011 года звярнуўся за дапамогай у вырашэнні праблемы да намесніка прэм'ер-міністра краіны Валерыя Іванова, аднак у адказ атрымаў толькі запэўніванні, што праблема знаходзіцца "у стадыі рашэння".

Кіраўнік Круглянскага ПМК-266 Мікалай Патрончык завітаў на прыём да дэпутата і віцэ-прэм'ера ў Круглым у лістападзе падчас яго сустрэчы з выбаршчыкамі. Дарэчы, гэта прадпрыемства лічыцца адной з лепшых будаўнічых арганізацый у краіне, яно неаднаразова заносілась на абласную і рэспубліканскія Дошкі гонару. Начальнік круглянскага ПМК-266 Мікалай Патрончык, які ўзначальвае арганізацыю з 1995 года, быў узнагароджаны медалём "За працоўную адзнаку", яму прысвоена званне "Заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь".

Мікалай Васільевіч распавёў Валерыю Іванову пра тое, што зараз прадпрыемства трапіла ў вельмі складаную сітуацыю з-за таго, што арганізацыі (у першую

(Заканчэнне на ст. 5)

Нават малая радзіма Аляксандра Лукашэнкі не можа разлічыцца з даўгамі

(Працяг. Пач. на ст. 4)

чаргу сельскагаспадарчыя) Шклоўскага і Круглянскага раёна не разлічваюцца за ўжо выкананыя будаўнічыя работы. Пытанне стаіць аб суме ў некалькі дзесяткаў мільёнаў рублёў. Між тым круглянскае ПМК-266 зараз будуе цэлы шэраг жывёлагадоўчых комплексаў у Шклоўскім і Круглянскім раёне, яно з'яўляецца асноўным выканаўцам будаўнічых работ на большасці абектаў у ААТ "Александрыйскае", на малой радзіме кіраўніка краіны Аляксандра Лукашэнкі, які, дарэчы, не раз даваў высокую адзнаку тэмпам і якасці будаўнічых работ, што выконваюць круглянскія будаўнікі.

Пытанне, якое ўзняў Мікалай Патрончык, не з'явілась навіной для віцэ-прэм'ера, аднак нічога канкрэтнага Валерый Іваноў круглянскім будаўнікам адказаць не здолеў. Адзінае, што паведаміў віцэ-прэм'ер і дэпутат, гэта тое, што праблема знаходзіцца ў стадыі рашэння. Таксама ён адзначыў, што раней у сувязі з адсутнасцю рэальных крыніц грашовых сродкаў пад запланаваныя аб'ёмы даводзілась аптымізаваць фінансаванне асобных дзяржпраграм.

Нагадаю, што 8 лістапада на пашыраным пасяджэнні Саўміна прэм'ер-міністр краіны Міхаіл Мяснікові выказаўся супраць далейшага эмісійнага фінансавання дзяржпраграм і друку «пустых грошай». Мясніковіч публічна прызнаў, што на праграмы жыллёвага будаўніцтва і будаўніцтва сельскагаспадарчых аб'ектаў на 2011 год дзяржава мела «нуль рублёў» грошай.

Але будаўнікам круглянскага ПМК-246, якія сумленна зрабілі сваю працу і не атрымалі за яе грошы, канстатацыя гэтага факта палёгкі не прыносіць. Як і не супакойваюць іх словы "народнага абранніка" Валерыя Іванова, змешчаныя ў газеце "Сельскае жыццё":



- Ситуация сегодня, действительно, не однозначная. Но катастрофы нет. Это и нужно людям правильно объяснять.

Што тут "правильно объяснять», калі людзі ўжо самі выдатна бачаць вынікі сямнаццацігадовага праўлення "усенароднаабранага" і яго паплечнікаў…

Барыс Вырвіч

Ідэолагі Магілёўшчыны рэкамендуюць раёнкам перайсці на штотыднёвы выпуск

Начальнік упраўлення ідэалагічнай работы Магілёўскага аблвыканкама Андрэй Кунцэвіч прапанаваў раённым газетам Магілёўскай вобласці перайсці на штотыднёвы выпуск. Такі варыянт падвышэння цікавасці жыхароў рэгіёна к мясцовай прэсе быў агучаны на прэс-канферэнцыі па выніках сацыяльнага развіцця Прыдняпроўскага края за 2011 год".

Андрэй Кунцэвіч выказаў меркаванне, што «Если районное издание выходит 2 раза в неделю в объеме 4 плюс 8, то одноразовый выпуск должен составить порядка 12 страниц. Читателю намного приятнее получить серьезную многостраничную газету, пусть и реже».

Крымінальная справа супраць супрацоўніцы аддзялення "Белаграпромбанка" ў Бялынічах, якая скрала грошы ў сіраты, узбуджана 13 лютага



Упраўленне следчага камітэта па Магілёўскай вобласці 13 лютага ўзбудзіла крымінальную справу па арт.211. ч. 1 Крымінальнага кодэкса (прысваенне або растрата) супраць непрацуючай несудзімай жыхаркі Бялыніч 1973 года нараджэння, паведамляе інтэрнэт-сайт УУС Магілёўскага аблвыканкама.

Гэта жанчына, працуючы спецыялістам па аперацыйна-касавай рабоце разлікова-касавага цэнтра Бялыніцкага філіяла "Белаграпромбанка" і з'яўляючыся матэрыяльна адказнай асобай, выкрала шляхам прысваення грашовыя сродкі з унёску навучэнкі Бялыніцкай школы-інтэрната для дзяцей-сірот, на суму 3 098 000 рублёў. Былая касірша затрымана згодна артыкула 108 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса.

Багдан Іваноў

Былы намеснік міністра ўнутраных спраў падазраецца ў "перавышэнні ўлады ці службовых паўнамоцтваў асобай, якая займае адказнае становішча".

Як інфармуе БЕЛТА, падчас расследавання было высветлена, што Яўгеній Полудзень "сістэматычна працяглы час атрымліваў ад службовых асобаў органаў унутраных спраў матэрыяльныя каштоўнасці і грашовыя сродкі".

Нагадаем, першая справа супраць былога намесніка міністра была распачатая ў снежні мінулага года па факце перавышэння ўлады ці службовых паўнамоцтваў. Ён быў звольнены з пасады і з міліцыі, ды дагэтуль знаходзіцца за кратамі.

Дзялёжка «беларускага пірага»



Рыгор Кастусёў. Намеснік старшыні Партыі БНФ, экс-кандыдат на пасаду прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на выбарах-2010. Нарадзіўся ў 1957 годзе ў вёсцы Цяхцін Бялыніцкага раёна. У 1982 годзе скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію па спэцыяльнасці інжынер-механік. Служыў у Савецкай арміі, працаваў галоўным інжынерам, дырэктарам саўгаса, дырэктарам Шклоўскага раённага аб'яднання жыллёва-камунальнай гаспадаркі. У 2001 годзе вымушаны быў сысці з пасады пад ціскам уладаў з-за працы ў камандах кандыдатаў ад дэмакратычных сілаў. Быў дырэктарам сумеснага беларуска-ўкраінскага прадпрыемства. Тройчы абіраўся дэпутатам мясцовых саветаў. Аўтар праграмы развіцця і рэфармавання жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь на 2010-2015 гады, прапанаванай Партыяй БНФ.

5 студзеня 2012 года Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ № 7 "Аб некаторых пытаннях пераўтварэння рэспубліканскіх унітарных прадпрыемстваў у адкрытыя акцыянерныя таварыствы". Дадзены дакумент, па сцвярджэнню прэс-службы прэзідэнта, скіраваны на прадухіленне разгрупавання акцый адкрытых акцыянерных таварыстваў сярод мінарытарных акцыянераў і прыцягненне інвестыцый у ствараемыя адкрытыя акцыянерныя таварыствы. План пераўтварэння такіх рэспубліканскіх унітарных прадпрыемстваў у ААТ на 2011-2013 гады быў зацверджаны пастановай Савета міністраў № 348 ад 21 сакавіка 2011 года.

Падпісаннем указа № 7 А.Лукашэнка практычна адкрывае новы этап — этап "прыхватызацыі" яшчэ не падзеленага да гэтай пары "беларускага пірага" пад выглядам плана прыватызацыі на 2011-2013 гады. Кіраўніцтва краіны проста растаптала правы беларускага народу на права валодання доляй прадпрыемства.

На продаж выстаўляюцца не стратныя прадпрыемствы, а паспяхова дзеючыя, эканамічна значымыя для нашай краіны, з абмежаваннем права калектываў гэтых прадпрыемстваў на ўдзел у працэсе прыватызацыі. Адназначна, можна смела казаць, што на 54 прадпрыемствы, унесеныя ў спіс па абмежаванню льготнага продажу акцый членам працоўнага калектыву, ужо сёння вызначаны пакупнікі.

Пад выглядам "благавіднага паступка", "з мэтай прыцягнення буйных інвестыцый, уваходжання беларускіх прадпрыемстваў у карпаратыўныя структуры" цынічна, нахабным спосабам адкатваецца схема дзеляжа ўласнасці беларускага народу.

З прыняццём указа № 7 становяцца зразумелымі дзеянні беларускіх уладаў і ў сельскай гаспадарцы апошнія паўтара дзесятка гадоў.

У апошнія 15 год пад выглядам пераўтварэння калгасаў і саўгасаў у больш эфектыўныя арганізацыйныя формы беларускія ўлады актыўна вядуць працу па аб'яднанню па некалькі былых гаспадарак у адну і пераводу іх у акцыянерныя таварыствы. Падобныя дзеянні беларускіх уладаў прыпадносяцца грамадзянам, пражываючым на тэрыторыі гаспадарак, як клопат аб іх дабрабыце.

Аб'яднанне некалькіх гаспадарак у адну дазваляе чыноўнікам дасягнуць толькі аднаго "эканамічнага"паказчыка — змяншэння колькасці стратных прадпрыемстваў у адпаведным рэгіёне. Але ж з далучэннем гаспадаркі да іншай у далучанай адразу ж пачынае заціхаць і жыццё. Такія вёскі падобным чынам прызначаны да вымірання. Людзі, якія раней там жылі і працавалі, пачынаюць яе пакідаць, так і не стаўшы гаспадарамі сваёй зямлі, зямлі, якая была ў свой час уласнасцю іх продкаў.

А што ж адбываецца з зямлёй?

А зямля нярэдка праз змену формы ўласнасці і аб'яднанне пераходзіць у распараджэнне ўтворанага акцыянернага таварыства, якое надалей далучаецца да прамысловага прадпрыемства або ўстановы ў выглядзе ААТ. І не заўсёды вядома, каму і колькі акцыяў гэтага прадпрыемства прыналежаць. Ёсць, відаць, далучаныя землі і ў прадпрыемстваў са спісу "54-х".

(Заканчэнне на ст. 7)

Дзялёжка «беларускага пірага»

(Заканчэнне. Пачатак на ст. 6)

Так што новыя ўладальнікі дадзеных прадпрыемстваў у хуткім часе могуць стаць і гаспадарамі значных плошчаў сельскагаспадарчых угоддзяў.

Працаўнікоў калгасаў, як калісьці іх дзядоў і прадзедаў рабавалі бальшавікі праз прымусовае ўступленне ў калгас, зноўку абрабавалі. Іх калектыўная маёмасць проста безсаромна ў іх рэквізуецца. Але гэта ўжо адбываецца ў прыхаванай форме і нават звычайна праводзіцца праз галасаванне, якое нярэдка адбываецца пад прымусам у прысутнасці супрацоўнікаў міліцыі. Запалоханым калгаснікам нічога не застаецца, як зноўку аднагалосна падняць рукі, падобна на тое, як гэта рабілі іх дзяды і прадзеды ў 20-я і 30-я гады мінулага стагоддзя.

Як, напрыклад, гэта адбылося ў 2010 годзе з былым калгасам “1-е Мая” Шклоўскага раёну. Калгасам, які за шматгадовую гісторыю свайго існавання ніколі не быў у пазыках перад дзяржавай. Калгаснікаў “угаварылі” пагадзіцца на далучэнне да ААТ “Александрыйскае”.

Першае, што зрабілі новыя гаспадары, — гэта тое, што з былой гаспадаркі адразу ж пасля далучэння былі вывезены сотні галоў буйной рагатай жывелы, кармы, зерне, тэхніка... Вытворчыя будынкі былі разбураны. Людзі засталіся без працы ў сваёй роднай весцы і вымушаны з’язджаць адтуль або ездзіць на працу за дзесяткі кіламетраў. Ну, а “Александрыйскае” пакрыла гэтым самым усе свае хібы і недахопы перад праверкай Камітэта дзяржкантролю.

Яшчэ “мудрэй” улады пастурілі ў Краснапольскім раёне Магілёўскай вобласці. Там за кошт раснастайных пературбацый усе былыя калгасы, саўгасы і іншыя сельгаспрадпрыемствы ў 2008-2009 гадах былі аб’яднаны ў адно — КУСП “Краснапольскі”. Карацей кажучы — раён ператварыўся ў адну вялікую гаспадарку. Але ж, што цікава, апарат чыноўнікаў раённага ўпраўлення сельскай гаспадаркі быў захаваны цалкам. Падобнае аб’яднане прывяло да пагаршэння эканамічных паказчыкаў раёна. Толькі за 2009 год страты ад зніжэння якасці прадаваемага дзяржаве малака пераўзышлі паказчык гадавога фонду заработнай платы прадпрыемства... На гэтым эксперыменты ў Краснапольскім раёне не закончыліся. Працаўнікоў сяла чакаюць новыя “рэформы”. Толькі не зразумела — на чыю карысць?..

Сама сабой напрошваецца высвова — на Беларусі ў прыхаванай форме распачынаецца працэс прыватызацыі зямлі і стварэнне новага класа землеўладальнікаў — “латыфундыстаў”. Пры гэтым грамадзянам краіны навязваецца меркаванне, што зямля на вёсцы нікому непатрэбная, на ёй ніхто не хоча працаваць...

Змена дачыненняў уласнасці на зямлю павінна праходзіць праз пераўтварэнні цяперашніх сельскагаспадарчых прадпрыемстваў (былых калгасаў, саўгасаў) з адначасовым увядзеннем у краіне прыватнай уласнасці на зямлю ў першую чаргу для тых, хто на ёй жыве і працуе. Праз стварэнне дзяржаўнага рэзервовага зямельнага фонду, зямельнымі ўчасткамі павінны забяспечвацца прыватныя сялянскія гаспадаркі.

Партыя БНФ заўсёды адстойвала і адстойвае ідэю стварэння ў Беларусі канкурэнтназдольнай сельскай, рыбнай і лясной гаспадаркі, каб не толькі забяспечыць нашае насельніцтва ў дастатковай колькасці экалагічна чыстымі прадуктамі харчавання, але і стварыць неабходны экспартны патэнцыял. Ад гэтага залежыць лёс і дабрабыт народа, палітычная стабільнасць у грамадстве. Дзеля дасягнення гэтай мэты



неабходна глыбокая аграрная рэформа, у тым ліку і зямельная рэформа, з увядзеннем прыватнай уласнасці на зямлю.

Асноўная мэта зямельнай рэформы — забяспячэнне рацыянальнага выкарыстання галоўнага нацыянальнага багацця краіны — зямлі — у інтарэсах грамадзян нашай краіны. Рэформа землекарыстання і прыватызацыя зямлі павінны выключыць усялякія сацыяльныя канфлікты.

Рыгор Кастусёў

Пенсіянераў усё больш

По стану на 1 студзеня 2012 года ў Бялыніцкім раёне атрымлівалі пенсію 6695 пенсіянераў, што складае 31,5 % ад усёй колькасці насельніцтва раёна. Сярэдні памер пенсіі па ўзросту ў снежні 2011 года склаў 887,3 тысячы рублёў.

Кожны наш пенсіянер
Стаў цяпер мілiянер.
Трэба трошкі пачакаць:
Мільярдэрам зможа стаць!

Так и сказала

«Я ужасно разочарована женской частью молодого поколения – они отвратительные матери, они скверные жёны, они недобрые, немилосердные люди».

*Лидия Ермошина,
Председатель ЦИК Республики Беларусь, «Еврорадио»*

Анекдот дня

- Привет! Как дела?

- Зачем спрашиваешь, в одной стране живём…

Бывший прокурор Минской области сидит в Шклове

Признанный виновным в коррупционных преступлениях бывший прокурор Минской области Михаил Снегирь отбывает наказание в нашем регионе - в колонии № 17 в Шклове.

Напомним, 7 мая 2010 года коллегия по уголовным делам Верховного суда Беларуси огласила приговор в отношении Михаила Снегиря и бывшего генерального директора ОАО «Забудова» Михаила Куделко. Суд признал Снегиря виновным в совершении преступлений, предусмотренных частью 3 статьи 430 (получение взятки), частью 3 статьи 424 (злоупотребление властью), частью 3 статьи 426 (превышение власти), частью 2 статьи 295 (хранение боеприпасов). По совокупности



Михаил Снегирь

преступлений ему назначено наказание в виде семи лет лишения свободы в колонии усиленного режима с конфискацией всего имущества, с лишением права занимать должности на государственной службе в течение пяти лет и лишением чина государственного советника юстиции третьего класса.

Повышение тарифов отложено

Правительство Беларуси намерено повысить коммунальные тарифы на теплоснабжение после окончания отопительного сезона.

Об этом сообщил журналистам во 14 февраля в Минске вице-премьер Анатолий Калинин, передает «Интерфакс-Запад».

«Повышение тарифов на услуги по теплоснабжению будет рассматриваться по окончании отопительного сезона», - сказал А.Калинин.

Как сообщалось, в соответствии с законом о бюджете на 2012 год, к концу года население должно возмещать тарифами не менее 35% стоимости жилищно-коммунальных услуг. В настоящее время доля возмещения незначительно превышает 20%.

На Магілёўшчыне ў дамах-інтэрнатах вольных месцаў амаль няма



У Магілёўскай вобласці ў дамах-інтэрнатах пражывае 2025 чалавек і вольных месцаў для пражывання амаль няма. Усяго ў вобласці створана дзевяць дамоў-інтэрнатаў на 2070 койка-месцаў, з іх 2 дамы-інтэрната агульнага тыпу, 6 дамоў-інтэрнатаў псіханеўралагічнага профіля і адзін дзіцячы дом-інтэрнат для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Псіханеўралагічныя і дзіцячыя дамы-інтэрнаты запоўнены цалкам, для памяшчэння людзей у гэтыя ўстановы нават існуе чарга. У двух дамах-інтэрнатах агульнага тыпу вольныя месцы ёсць толькі дзякуючы таму, што ў 13 раёнах вобласці пры цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва створаны аддзяленні кругласутачнага знаходжання для састарэлых і інвалідаў.

Нягледзечы на тое, што на ўзмацненне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў сацыяльнага абслугоўвання ў вобласці ў 2011 годзе зрасходавана 8 498,6 мільёнаў рублёў і, па меркаванні старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Магілёўскага аблвыканкама Святланы Тарасенка, «в домах-интернатах области созданы и из года в год улучшаются бытовые условия пребывания престарелых граждан и инвалидов", праблем у працы ў гэтых устаноў больш чым дастаткова. Ды і як можа быць інакш, калі яны запоўнены практычна цалкам, месцаў не хапае, не дапамагае нават тое, што ў аддзяленнях кругласутачнага знаходжання разгорнута больш за 600 койка-месцаў. Значная частка пражываючых у сілу ўзросту і хваробаў не можа абслугоўваць сябе самастойна, нагрузка на абслугоўваючы персанал гэтых устаноў вельмі вялікая, між тым заробкі работнікаў сацыяльных устаноў знаходзяцца на самым нізкім узроўні сярод працаўнікоў вобласці. Аднак гэтыя праблемы магілёўскіх чыноўнікаў не вельмі хвалююць…

Штомесячна ў дамы-інтэрнаты Магілёўскай вобласці памяшчаецца каля дваццаці чалавек.

Барыс Вырвіч

“Не пренебрегай человека в старости его, ибо и мы стареем” (Сир. 8,7).

“Во время сытости вспоминай о времени голода, и во дни богатства — о бедности и нужде” (Сир. 18,25).

Рэгіён

Грамадска-палітычная газета.
Выдаецца на беларускай і рускай мовах,
распаўсюджваецца бясплатна

Надрукавана на ўласным абсталяванні па адрасе: г. Магілёў, вул. Чкалава, 16. Тэл. 8 (02232)37-365. Наклад 299 асобнікаў. Выдавец Барысаў Іван Віктаравіч. Падпісана ў друк 14.02.2012 г. у 16-00